ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 60 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, телеф. № 908.
ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.
Кошт асобнага №—2 кап.

№ 148 (1417) ПАНЯДЗЕЛАК, 29 чэрвеня 1931 г.

ПА ТОЙ БОК МЯЖЫ

Фінскія фашыстыя аднаўляюць антысавецкую кампанію

ГЕЛЬСІНГФОРС.—Пасьля часовага зацішша зноў прыкметна ўзмацненьне антысавецкай кампаніі вакол інгерманляндзкага пытаньня. Пад гэтым знакам праходзіў 4-ты зьезд фінна-угорскіх плямёнаў, які нядаўна закончыўся. У цэнтры ўвагі зьезду былі антысавецкія выступленьні. Усё гэта адбывалася ў прысутнасьці членаў фінляндзкага ўраду.

У аднаведным духу выступалі на зьезьдзе афіцыяльныя асобы, аж да старшыні сойму Каліо, які ў сваёй прамове выказаў шкадаваньне з тае прычыны, што насельніцтва Інгерманляндыі і далёкай Карэліі не выступае на зьезьдзе. Каліо між іншым заявіў: „Параўноўваючы лёс эстонскага народу з лёсам інгерманляндцаў і карэлаў, мы можам спадзявацца, што бог справядлівасьці пачуе таксама і малітвы апошніх“.

На зьезьдзе выступіў таксама і вядомы фінскі фашысцкі дзеяч Саарцале па пытаньнях абароны.

У ліпені месяцы так званым „Цэнтральным камітэтам савецкіх народаў“ вырашана правесьці па ўсёй краіне карэльскія і інгерманляндзкія сьвяты, мэта якіх, па словах арганізатараў, выявіць свае адносіны да „ганеньняў“ супроць інгерманляндцаў у СССР. Падазраючы антысавецкую кампанію, газэты, у тым ліку „Усі Суомі“, зноў узьмацняюць выдумку аб прасьледваньнях інгерманляндцаў у СССР.

Стачачны фронт амэрыканскіх гарнякоў

НЬЮ-ЁРК. 1.000 пікетаў бастуючых гарнякоў у раёне Пітсбурга (штат Пэнсыльванія), якія прымыкаюць да рэвалюцыйнага нацыянальнага саюзу гарнякоў, удалося зьвесьці на нішто спробу аднаго з буйнейшых вугальных раёнаў аднавіць работу на 5-ці капальнях на аснове штрэйкбрэхерскай згоды, складзенай рэформісцкім аб'яднаньнем саюзу гарнякоў (прымыкаюць да амэрыканскай фэдэрацыі працы) з губэрнатарам Пэнсыльваніі—Пінчотам.

Тэрор улады працягваецца. Шматлікія арышты праведзены ў Пэнсыльваніі, Огайо і Заходняй Віргініі, дзе бастуе 40.000 рабочых.

Стачка 12 тысяч тэкстыльшчыкаў у Тарасе

ПАРЫЖ. 26. Як паведамляе мадрыцкая газэта „Эль-Соль“ 12 тысяч тэкстыльшчыкаў у Тарасе (Каталёнія) абвясьцілі стачку.

Рабочы рух у Гішпаніі пашыраецца

ПАРЫЖ. 3 розных гарадоў Гішпаніі паведамляюць аб пашырэньні рабочага руху. У ваколіцах Барсэлёны забаставалі сельска-гаспадарчыя рабочыя, якія прымыкаюць да нацыянальнай конфэдэрацыі працы (анарха-сындыкалісцкая). У Барсэлёне рабочыя ўжо 3-ці дзень кіруюць захопленаю імі шкляною гутаю „Зорыльля“.

Спартакіяда павінна быць,—спартакіяда будзе

БЭРЛІН.—Нямецкі буржуазны друк працягвае цкаваньне супроць міжнароднай спартакіяды. Некаторыя газэты паведамляюць, што нямецкі міністар унутраных спраў Вірт ужо рэкомэндаваў прускаму міністру ўнутраных спраў Зэверынгу зноў забараніць спартакіяду.

ДАМАГЧЫСЯ КАНЧАТКОВАГА ПЕРАЛОМУ

Падрыхтоўка да Усебеларускага рабсэлькораўскага зьезду па сэкцыі торпу пераходзіць ужо ў другі этап. Калі раней задача зводзілася да таго, каб як мага хутчэй давесьці тэзісы да кожнага рабочага тарпяніка і тарпяніцы, дык зараз абмяжавацца гэтай работай мала!

Зараз паўстае пытаньне аб тым, каб як мага глыбей арганізаваць прапрацоўку тэзісаў і сабраць да іх неабходныя рабочыя прапановы і зьмены. Аднак, гэта задача пакуль што слаба вырашаецца радамі раёнаў, рад заводаў глыбокай прапрацоўкі тэзісаў яшчэ і не пачынаў.

Але за гэта трэба змагацца!

Прыклад разгортваньня гэтай работы на Міхановіцкім заводзе і на торпзаводзе „Шлях соцыялізму“ сьведчыць аб тым, што пры правільнай арганізацыі ўвагі грамадзкасьці і правільнай арганізацыі прапрацоўкі тэзісаў можна дабіцца значнага зруху ў рабоце торпзаводу і павялічэньня здабычы.

Той факт, што прапрацоўка тэзісаў непарыўна зьвязана з рацыяналізацыяй торпараспрацовак, з конкрэтнымі задачамі рабсэлькораў у барацьбе за забясьпячэньне прамысловасьці палівам, сьведчыць аб тым, што гэта—справа ўсёй грамадзкасьці тарпяных заводаў.

Добрая распрацоўка тэзісаў на торпзаводзе „Шлях да соцыялізму“ прывяла да таго, што зараз вырашна выззначыўся карэнны зрух у разгортваньні соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Другі этап разгортваньня і прапрацоўкі тэзісаў павінен даць рэзкі пералом у выкананьні вытворчых заданьняў, хутчэйшым ажыцьцяўленьні ўсіх рацыяналізатарскіх прапаноў, павялічэньні арміі рабсэлькораў-ударнікаў на торпзаводах.

Тлумачыцца гэта тым, што ўся прапрацоўка тэзісаў цесна ўвязана з павялічэньнем вытворчасьці, з паглыбленьнем новых форм і мэтодаў работы, з прывіцьцём соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Вось чаму асноўні этап у падрыхтоўцы да рабсэлькораўскага зьезду павінен прымусіць запрацаваць усе грамадзкія арганізацыі тарпяных заводаў, кінуць усе сілы на тое, каб масы самі рэагавалі і ўносілі свае зьмены і дадаткі ў тэзісы сэкцыі торпу.

Асаблівую ўвагу пры прапрацоўцы тэзісаў і падрыхтоўцы да рабсэлькораўскага зьезду неабходна зьвярнуць на разгортваньне працы насьценгазэт і шматтыражак на торпзаводах.

Насьценная газэта „Чырвоная Зьмена“, якая выдаецца на Добрускім торпзаводзе „Шлях да соцыялізму“, паказвае прыклад арганізацыі опэратыўнай работы і сьведчыць аб тым, што пры правільнай арганізацыі працы газэта можа давесьці да канца справу, за якую яна ўзялася.

11 дзён засталося да пачатку зьезду. За гэтыя 11 дзён комсамол павінен выканаць узятыя на сябе абавязкі: мобілізаваць 50 чал. для работы ў нізавы друк, арганізаваць пры кожным калгасе і саўгасе, пры кожным прадпрыемстве, насьценгазэты, шматтыражкі. Да кантрольнага пленуму ЦК ЛКСМБ комсамол павінен прынесьці рапарты аб перамогах на фронце выкананьня плянӑў торпаздабычы, далейшага разгортваньня рацыяналізацыі торпаздабычы і барацьбы нізавога друку за замацаваньне гэтай работы.

Мы дрэнна рыхтуемся да Усебеларускага піонэрзьлёту

У другой палове ліпеня, згодна пастановы ЦК КП(б)Б, склікаецца другі ўсебеларускі піонэрскі зьлёт. Гэты зьлёт адбудзецца ў пэрыяд разгорнутага наступу соцыялізму па ўсім фронце.

„Уступленьне СССР у пэрыяд соцыялізму, вялізарныя соцыяльна-экономічныя і культурныя зрухі, якія адбыліся ў краіне за першыя два гады пяцігодкі, дзякуючы правільнай генэральнай лініі партыі і яе ленінскага ЦК, прывялі да рэзкага палепшаньня становішча дзяцей і работы сярод іх з боку пролетарскай дзяржавы і забясьпечылі пераход да ўсеагульнага пачатковага навучаньня і разгорнутай барацьбы за політэхнізм“. (IX зьезд УсеЛКСМ)

Удзел працоўнай дзетвары ў нашай вялізарнай і нябачанай дагэтуль соцыялістычнай будоўлі з кожным днём прымае ўсё большыя і большыя памеры.

Аднак, трэба падкрэсьліць, што посьпехі піонэрорганізацыі ўсё-ж „надзвычайна малыя ў параўнаньні з патрэбамі і магчымасьцямі для росту і якаснага палепшаньня арганізацыі да патрабаваньняў, якія дыктуюцца ўсім ходам соцыялістычнага наступу пролетарыяту“. (IX УсеЛКСМ)

Другі ўсебеларускі піонэрскі зьлёт павінен яшчэ больш мобілізаваць піонэрскую арганізацыю БССР на ўдзел у будаўніцтве соцыялізму.

Друк у падрыхтоўцы да зьлёту павінен заняць адно з першых месц.

Аднак, ня гледзячы на тое, што пастанова ЦК КП(б)Б аб скліканьні зьлёту была вынесена некалькі тыдняў таму назад, ніводная з цэнтральных газэт („Зьвязда“, „Рабочы“, „Савецкая Беларусь“ і інш.), за выключэньнем піонэрскага друку, ніводным словам за ўвесь чэрвень месяц аб зьлёце (і ня толькі аб зьлёце, але наогул аб піонэрскай рабоце) не адгукнуліся.

У парадку самакрытыкі трэба падкрэсьліць, што і мы не „адсталі“ ад цэнтральных газэт і толькі некалькі дзён таму назад выступілі з перадоўкай і падборкай, прысьвечанымі піонэрскаму зьлёту. Але гэта вусім недастаткова. Мы гэта лічым вусім ненормальным, тым больш, што ў наш абавязак уваходзіць задачы мобілізацыі ўсёй комсамольскай і піонэрскай арганізацыі ў першую чаргу на падрыхтоўку да зьлёту.

У бліжэйшыя дні мы гэту памылку выправім, яшчэ больш разгорнем работу па асьвятленьню ходу падрыхтоўкі да зьлёту.

Аднак, гэта ні ў якім разе ня здымае адказнасьці ўсяго партыйнага, савецкага друку за асьвятленьне падрыхтоўкі да піонэрскага зьлёту і наогул за работу сярод піонэраў.

Рэдакцыі газэт, асабліва раённых, павінны неадкладна ўдзяліць асаблівую ўвагу раённым зьлётам, якія ў бліжэйшыя дні склікаюцца ў радзе раёнаў.

Рэдакцыі цэнтральных газэт павінны неадкладна ўключыцца ў падрыхтоўчую работу па зьлёту, асьвятляць на сваіх старонках становішча і работу піонэрорганізацыі.

Трэба наладзіць рэйды-праверкі, каб высьвятліць, як наркаматы выконваюць той наказ, які быў дадзены ім першым Усебеларускім зьлётам.

Трэба паказаць барацьбу піонэрскай арганізацыі над кіраўніцтвам партыі і комсамолу за прамфінплян, соцыялістычную рэконструкцыю сельскае гаспадаркі, трэба навучыць працоўную дзетвару палюбіць, ненавідзець і змагацца з клясавым ворагам.

Рыхтуемся да ўсебеларускага зьезду рабсэлькораў

ДОБРУСКІЯ ТАРПЯНІКІ РАЗГАРНУЛІ ПАДРЫХТОЎКУ ДА ЗЬЕЗДУ РАБСЕЛЬКОРАЎ

Ударнікі-тарпянікі сумесна з спэцыялістымі ўносяць дадаткі па рацыяналізацыі торпаздабычы

У падрыхтоўцы да зьезду раўняйцеся на добрускіх тарпяніках

Пералом ёсьць!

Распрацоўка тэзісаў па сэкцыі торпу на торпазаводзе „Шлях да соцыялізму“ пачалася некалькі дзён таму назад.

Да гэтага часу ні партыйныя, ні комсамольска-профэсыйныя арганізацыі гэтым пытаньнем не займаліся.

Зараз тэзісы распрацоўваюцца надзвычайна ўважліва, групы рабочых працуюць над паасобнымі пытаньнямі.

Так, група спэцыялістых працуе над пытаньнем рацыяналізацыі торпаздабычы. Вызначаны конкрэтныя вучасткі і процэсы, якія павінны быць рацыяналізаваны ў бліжэйшы час.

Спэцыялістыя т. т. Марголін і Рубінчык выпрацоўваюць соцыялістычны рахунак рацыяналізацыі торпаздабычы да рабсэлькораўскага зьезду.

Група Макарэвіча працуе над пытаньнямі падрыхтоўкі кадраў і працы ФЗВ на торпазаводах. Гэтыя прапановы будуць унесены як дадатак да тэзісаў.

Рад комсамольцаў працуе па выпуску газэты „Чырвоная Зьмена“ на торпазаводзе і зьбірае матар'ял—дадаткі да тэзісаў.

Трэба адзначыць, што яшчэ ня ўся маса ўцягнута ў прапрацоўку тэзісаў, не праведзены гутаркі па бараках аб значэньні рабсэлькораўскага зьезду, хоць аб гэтым і была пастанова агульнага сходу.

„Чырвоная Зьмена на торпазаводзе“ праводзіць вялікую работу па зьнішчэньню недахопаў і выкананьню вытворчых заданьняў.


Газэта бязьлітасна б'е па ўсіх, хто ня хоча прыняць удзелу ў падрыхтоўцы да зьезду і ня зьбірае лепшыя прапановы да тэзісаў.

У сувязку з падрыхтоўкай да зьезду шыроразгарнулася соцспаборніцтва і ўдарніцтва.

У падрыхтоўцы да зьезду на торпазаводзе „Шлях да соцыялізму“ ёсьць пералом. Задача цяпер у тым, каб пад кіраўніцтвам партыйнай комсамольскай і профэсыйнай арганізацый ахапіць падрыхтоўкай усіх рабочых і выканаць абавязацельства, якое вынесьлі рабочыя на сваім сходзе, што кожны з іх—дэлегат зьезду.

Ад выязной рэдакцыі: Шапіра.

СПЫНІЦЬ ПАДЗЕНЬНЕ КРЫВОЙ!



25-га чэрвеня дало зьніжэньне здабычы торпу ў параўнаньні з мінулым днём. Усяго здабыта за гэты дзень 3153,1 тон торпу, што складае 38,5 проц. сутачнага заданьня. Такім чынам, сэзонны плян выкананы на 13,4 проц.. Да гэтага дня здабыта 93851,2 тон торпу, што складае 31,6 проц. каляндарнага пляну.

Ператварыць пляны ў жыцьцё

Менскім гаркамолам мобілізавана 100 комсамольцаў на торпараспрацоўкі Менскага раёну, галоўным чынам на распрацоўкі Менрайпрамсаюзу, якія ня выконваюць плянӑў торпаздабычы.

Зараз выпрацаваны плян дапамогі рабочай сілай на Цнянскіх торпараспрацоўках, паводле якога там кожны дзень павінна працаваць 150 чалавек, якія будуць займацца канчатковай выпрацоўкай торпу, пераварочваньнем, адгрузкай і г. д.

За ўдарную працу на эльводаўскіх распрацоўках гарком комсамолу прэміяваў трох лепшых ударнікаў-кар'ершчыкаў.

Аднак, Гарсавет не наладзіўся адвесьці для гораду плян з торпам. Такім чынам, горад ня мае торпу на 1931 г.

Гарсавет і адміністрацыя Эльводу павінны прыняць усе захады, каб забясьпечыць горад торпам на ўсю зіму.

Хойман.

БАЛЬШАВІЦКІМІ ТЭМПАМІ РЫХТАВАЦЦА ДА ЗЬЛЁТУ 3-й ЗЬМЕНЫ

МОБІЛІЗУЕМ ПІОНЭРСКІЯ МАСЫ У БОЙКУ ЗА „518“ і „1040“

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

Савецкі Саюз уступіў у пэрыод соцыялізму. У краіне Саветаў адбыліся вялізарныя соцыяльна-эканомічныя і культурныя зрухі за першыя два гады пяцігодкі. Дзякуючы правільнай генэральнай лініі комуністычнай партыі і выпрабаванаму кіраўніцтву ленінскага ЦК, рабочая кляса перамагае на ўсіх франтох соцыялістычнага будаўніцтва. У выніку гэтага, разам з агульным палепшаньнем становішча рабочае клясы і ўсіх працоўных, паляпшаецца становішча дзяцей і праца сярод дзяцей. Работа сярод дзяцей, ажыцьцяўленьне ўсеагульнага навучаньня, разгорнутая барацьба за політэхнізм, барацьба за тое, каб забясьпечыць выхаваньне праз школу пакаленьня „здольнага канчаткова ўстанавіць комунізм“—сталі ва ўсю шырыню перад комуністычнай партыяй, савецкім урадам і ўсёй пролетарскай грамадзкасьцю Саюзу ССР.

Абвастрэньне клясавай барацьбы ў краіне з асаблівай сілай высоўвае перад партыяй, комсамолам і ўсёй пролетарскай грамадзкасьцю задачу замацаваньня ўсіх зьвеньняў комуністычнага выхаваньня дзяцей.

Шэсьць месяцаў таму назад партыйна-комсамольская і профэсыйная конфэрэнцыя па піонэр-руху констатавала:

„Адным з важнейшых вучасткаў клясавай барацьбы зьяўляецца барацьба за дзяцей. Клясава-варожыя элемэнты вядуць барацьбу за падрастаючае пакаленьне, імкнуцца накіраваць яго супроць партыі і комсамолу.

Адсюль перад намі, як ніколі, з усёй вастратою паўстае задача ўзмацненьня комуністычнага выхаваньня дзяцей працоўных, шляхам прыцягненьня іх да практычнага ўдзелу ў соцыялістычным будаўніцтве. Гэта патрабуе з другога боку рашучага павароту ўсёй пролетарскай грамадзкасьці да выхаваньня мас працоўнай дзетвары“.

Два гады прайшло з таго часу, як адбыўся першы ўсебеларускі зьлёт піонэраў. Гэта два гады актыўнай дзейнасьці піонэрскай організацыі і пад яе кіраўніцтвам ўсёй працоўнай дзетвары на фронтах соцыялістычнага будаўніцтва. Гэта два гады дапамогі з боку дзяцей працоўных партыі і комсамолу, уладзе ў выкананьні першых двух год пяцігодкі.

Урад БССР уручыў піонэрам дзяржаўнае заданьне, у якім вызначыў шляхі дзейнасьці піонэраў і дзяцей працоўных ў трэцім годзе пяцігодкі.

НКА, НКЗБ і ВСНГБ склалі дагаворы з піонэрскай організацыяй, дзе на грунце дзяржаўнага заданьня конкрэтызаваны задачы ў пасільных для дзяцей формах па паасобных важнейшых галінах народнае гаспадаркі.

Дзеці працоўных з гонарам выконваюць узятыя на сябе абавязацельствы. На фабрыках, заводах, у колгасах і саўгасах ідзе настойлівая работа дзяцей па пабудове разам з рабочаю клясай фундаманту соцыялістычнай экономікі.

Дзеці разам з дарослымі пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі вядуць барацьбу за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну на фабрыках і заводах, за мобілізацыю ўнутраных расурсаў, за суцэльную колектывізацыю і ліквідацыю на гэтай аснове кулацтва як клясы, за разгортваньне культурнай рэволюцыі, за зьнішчэньне рэшткаў капіталізму ў горадзе і вёсцы.

Усё гэта надзвычайна ўзьняло політычную актыўнасьць дзяцей і стварыла ўмовы для прыцягненьня ўсёй масы дзяцей працоўных да ўдзелу ў соцыялістычным будаўніцтве і шырокага ахопу іх піонэрскай організацыяй.

Рашэньнямі партыі і Ураду ў ліпені г. г. склікаецца Другі ўсебеларускі зьлёт піонэраў для падагульненьня працы сярод дзяцей за мінулы час, для намячэньня далейшых задач конкрэтнай работы піонэрорганізацый у змаганьні за пяцігодку.

Напярэдадні другога ўсебеларускага зьлёту піонэраў, прэзыдыум ЦВК і СНК БССР зварочваюць увагу Саветаў, профсаюзаў, усяе рабочае клясы, колгасьнікаў, сялян-беднякоў і сераднякоў, культасьветнікаў, інжынэрна-тэхнічнага пэрсоналу, коопэрацыйных і іншых грамадзкіх організацый і прапануюць ім праверыць:

Ці дастаткова вы ўдзельнічаеце ў барацьбе за адзіны плян комуністычнага выхаваньня.

Ці дастаткова змагаецеся вы, рабочыя, за ператварэньне школы ў цэх вытворчасьці і перадачу ўсяго соцыялістычнага энтузіязму, энэргіі і ўздыму рабочае клясы нашым дзецям, падрастаючаму пакаленьню.

Ці дастаткова разгорнута сярод дзяцей політычная і культ-масавая работа.

Ці ажыцьцяўлены задачы партыі аб усеагульным пачатковым навучаньні. Ці створаны ўсе ўмовы для таго, каб выхоўваць з падрастаючай зьмены сапраўдных бальшавікоў—будаўнікоў новага соцыялістычнага грамадзтва.

Ці дастаткова разгорнута работа па выкананьню тых абавязацельстваў, якія былі ўзяты профсаюзамі, саветамі, коопэрацыйнымі і грамадзкімі організацыямі яшчэ на першым зьлёце піонэраў.

Мы яшчэ сустракаемся ў паасобных выпадках з яўна-бюрократычнымі, яўна-опортуністычнымі адносінамі і недаацэнкай ролі піонэрскай організацыі, як важака і організатара ўсёй працоўнай дзетвары на выкананьне задач партыі, ураду і комсамолу.

Мы яшчэ сустракаемся з недастатковай увагай паасобных профсаюзаў, савецкіх установаў і грамадзкіх організацый да пытаньняў перабудовы нашае школы ў сапраўды-політэхнічную школу.

Мы яшчэ сустракаемся з фактамі яўна-опортуністычнай недаацэнкі тых задач, якія паставіла партыя перад усёй пролетарскай грамадзкасьцю па выкананьню адзінага пляну комуністычнага выхаваньня.

Справа комуністычнага выхаваньня падрастаючага пакаленьня — справа усяе пролетарскае грамадзкасьці, і зьяўляецца неадрыўнаю часткай рэволюцыйнага інтэрнацыянальнага выхаваньня пролетарыяту і працоўных мас.

Надаючы надзвычайна важнае політычнае значэньне другому ўсебеларускаму зьлёту піонэраў прэзыдыум ЦВК і СНК БССР зьвяртаюцца да ўсіх рабочых і работніц, колгасьнікаў і колгасьніц, да ўсіх працоўных гораду і вёскі, грамадзкіх, профсаюзных і партыйных організацый:

Таварышы рабочыя і работніцы! Толькі Кастрычнікаўская рэволюцыя дала магчымасьць вашы дзецям выхоўвацца ў сапраўдным комуністычным духу. Абкружэце клопатам і ўвагай працоўную дзетвару. Уцягнеце яе ў барацьбу рабочае клясы за бальшавіцкія тэмпы, за пасьпяховае выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады. Наблізьце школу да вытворчасьці, каб яна сапраўды стала цэхам заводу, фабрыкі. Уключэце ў пляны барацьбы за соцыялістычнае будаўніцтва пытаньне барацьбы за новую, сапраўды працоўную політэхнічную школу, за ажыцьцяўленьне рашэньняў партыі і ўраду аб усеагульным навучаньні, аб нацыянальна-культурным будаўніцтве. Перадайце сваім дзецям, дзецям усёй рабочай клясы вопыт рэволюцыйнай барацьбы за рабочую справу, за соцыялізм.

Таварышы колгасьнікі і колгасьніцы! Вы перадавікі соцыялістычнай вёскі, змагары за новае соцыялістычнае жыцьцё, барацьбіты з старым укладам і формамі дробнауласьніцкае вёскі. Абкружэце клопатамі і ўвагаю дзяцей колгасьнікаў, беднаты, батрацтва. Будзьце сапраўднай і моцнай апорай рабочае клясы ў барацьбе за політэхнізацыю колгаснае школы. Організуйце правільна дзіцячую працу па дапамозе вам у соцыялістычнай перабудове вёскі.

Больш клясавай пільнасьці да праяў дзейнасьці клясавых ворагаў.

Кулак, шкоднік і ўся контр-рэволюцыйная зграя, супраціўляючыся соцыялістычнаму наступу, імкнуцца аўладаць дзецьмі, каб скарыстаць іх у сваёй барацьбе супроць мерапрыемстваў па соцыялістычнай перабудове вёскі.

Больш уважлівасьці да політычнага клясавага выхаваньня дзяцей. Дапамагайце дзецям больш уяўляць іх задачы клясавай барацьбы, па выкарчоўваньню рэшткаў капіталізму ў горадзе і вёсцы, па ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай колектывізацыі.

Здабытыя комуністычнай партыяй і рабочай клясай колгасныя перамогі,—ёсьць перамогі і дзяцей працоўных. Ідучы пад кіраўніцтвам компартыі да новых перамог, уцягнеце ва ўсю сваю работу і дзяцей. На конкрэтных вучастках барацьбы за колгасы дапамагайце компартыі і комсамолу ў замацаваньні комуністычнага выхаваньня дзяцей.

Саветы і профсаюзы

Больш увагі піонэрам у іх штодзённай рабоце. Уцягнеце піонэраў і дзяцей працоўных у актыўную дапамогу ў вашай штодзённай конкрэтнай рабоце.

Вядзеце неаслабна барацьбу з усімі тымі, хто опортуністычна недаацэньвае політычную ролю дзіцячага комуністычнага руху.

Дапамагайце піонэрам у выкананьні дагавору з ВСНГБ, НКЗ і НК Асьветы, у выкананьні тых задач і абавязкаў, якія ўзялі на сябе піонэры і наогул дзеці працоўных ад ураду па барацьбе за пяцігодку ў чатыры гады, за соцыялістычнае будаўніцтва. Давайце дзецям пасільныя новыя заданьні, з замілаваньнем і чула адносьцеся да кожнай, нават маленькай практычнай працы, праробленай дзецьмі ў выкананьне пляну соцыялістычнага будаўніцтва. Заахвочвайце дзяцей да ўдзелу ў справе соцыялістычнага будаўніцтва

Таварышы спэцыялістыя і інжынэрна-тэхнічны пэрсонал! У барацьбу за аўладаньне вышынямі навукі і тэхнікі ўключыліся піонэры і дзеці працоўных. На дапамогу ім, каб аўладаць цытадэлямі навукі і тэхнікі павінны прыйсьці разам з рабочаю клясай і вы.

Дапамажэце ў рабоце піонэрскім гуртком тэхнікі, плянэрным і модэльным. Дапамажэце дзецям у політэхнізацыі і аўладаньні вытворчымі процэсамі.

Таварышы чырвонасьцяжныя настаўнікі БССР! Комуністычнай партыяй і рабочаю клясай ускладзена на Вас вялікая задача—праз школу, пазашкольную работу пад кіраўніцтвам компартыі выхоўваць пакаленьне, здольнае ажыцьцяўляць комунізм.

Больш увагі дзецям. Дапамагайце комуністычнай партыі, комсамолу і рабочай клясе ў барацьбе з клясавымі ворагамі, якія імкнуцца выкарыстаць школу, як важнейшы вучастак культурнага і ідэолёгічнага фронту для сваіх контр-рэволюцыйных мэт. Моцна біце па вялікадзяржаўным шовінізме, беларускім контр-рэволюцыйным нацдэмократызьме, па шовіністых іншых колераў—агентах клясавага ворага.

Пастаўце работу так, каб школа была сапраўдным правадніком ідэйнага, організацыйнага і выхаваўчага ўплыву пролетарыяту на паўпролетарскія і непролетарскія пласты працоўных мас.

Прэзыдыум ЦВК і СНК БССР заклікаюць усе профсаюзныя, савецкія, коопэрацыйныя і грамадзкія організацыі прыняць актыўны ўдзел у дапамозе піонэрам рыхтавацца да **другога ўсебеларускага зьлёту** піонэраў. Мобілізуйцеся на дапамогу і правядзеньне раённых зьлётаў,—мобілізуйце ўдарнікаў-перадавікоў соцыялістычнага будаўніцтва на актыўны ўдзел у правядзеньні зьлётаў. Разгарнеце шырокую справаздачнасьць перад дзецьмі, рабочымі і колгасьнікамі і аб сваім удзеле ў выкананьні адзінага пляну комуністычнага выхаваньня.

Піонэры, школьнікі і ўсе дзеці працоўных! Вы ўзялі на сябе пачэсны абавязак. Вы ўзяліся пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі і комсамолу выконваць урадавае заданьне, прыняць актыўны ўдзел у рабоце ўсіх галін народнае гаспадаркі.

Больш сувязі з рабочымі колектывамі і колгасьнікамі.

Усю сваю работу надпарадкуйце задачам пасьпяховага выкананьня прамфінпляну, колектывізацыі, ахове бальшавіцкага ўраджаю і правядзеньню ўборачнай кампаніі.

На практычным удзеле ў соц. будаўніцтве вучэцеся ад лепшых ударнікаў, мацуйце свой уплыў на неорганізаваных дзяцей, павялічайце свае рады, ідзеце да зьлёту мільённай піонэрскай арміяй.

Пад сьцягам Леніна—да новых перамог!

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Старшыня Савету Народных Камісаў БССР **М. Галадзед.**

Сэкратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **М. Гнілякевіч.**

27-га чэрвеня 1931 г.
г. Менск.

ДА КАНТРОЛЬНАГА ПЛЕНУМУ ЦК.

За шматмільённы комсамол

Міноў

II.

Ацэнка дадзеная Цэнтральным Камітэтам дзейнасьці Украінскай, Ленінградзкай, Ніжня-Волскай і Іванаўскай організацый ў лютым месяцы аб уцягненьні рабочай моладзі ў комсамол, поўнасьцю адносілася да ўсіх вытворчых організацый комсамолу Беларусі.

Беларускі комсамол таксама як і Украінская і Ленінградзкая організацыі, „ня змог так організаваць работу па вучоту, каб асноўны ўпор сконцэнтраваць на ўдарнай брыгадзе, зьвяне, каб мэтоды работы і вярбоўкі былі прыстасаваны да асаблівасьцяў паасобных груп і кваліфікацыі моладзі“.

Работа організацый характарызавалася агульным, неконкрэтным кіраўніцтвам і адсутнасьцю праверкі выкананьня.

Ня было „сапраўды баявой работы па аказаньню дапамогі з боку камітэтаў у організацыі ўзорнай работы па росту на важнейшых, вядучых прадпрыемствах і цэхах“.

Прагляд-праверка росту Менскай організацыі, які праводзіла „Чырвоная Зьмена“ ў лютым месяцы, выявіў—самацёк у росьце, адсутнасьць разгорнутай масавай работы с род рабочай моладзі ў групах, зьвеньнях, брыгадах, агрэгатах, цэхах.

Ня было дэфэрэнцыйнага падыходу да паасобных груп рабочай моладзі, не вывучаўся твар рабочага падлетка.

У выніку—зусім недапушчальныя тэмпы росту. На заводзе „Бальшавік“ за два месяцы, якія мінулі ад 9-га зьезду, у комсамол было прынята каля 3-х дзесяткаў чалавек. На фабрыцы „Беларуска“—11, у ячэйцы вагонарамонтных майстэрнях МББ— 15 і г. д.

Яшчэ горшыя паказчыкі росту давала Гомельская, Віцебская, Барысаўская і Бабруйская організацыя комсамолу.

Афармляць у КСМ не даўжэй, чым у 2 дэкады

Зацягваецца афармленьне новаўступаючых ў комсамол.

У Петрыкаўскім раёне быў такі абураючы факт (як пісаў у „Чырвоную Зьмену“ малады рабочы Ф. Е):

„У 1928 годзе я падаў заяву ў комсамол. У той час я працаваў на заводзе „Зорка“. Агульны сход мяне зацьвердзіў. Я лічыўся комсамольцам. Хадзіў на зачыненыя сходы, нёс нагрузкі.

У 1929 годзе мяне колектыў паслаў на раённыя піонэрскія курсы.

Зьявіўся я ў раён, але там мне паведамілі, што я не комсамолец, і што маёй анкеты райком не атрымліваў.

Я зьвярнуўся на завод, зноў я стаў уступаць у комсамольскую організацыю, праз два гады пасьля майго першага ўступленьня.

Вельмі доўга цягнулася справа з разборам маёй заявы, а калі гэты доўгачаканы дзень надышоў, дык я працаваў ужо вылучэнцам з заводу ў коопэрацыі.

Палічыўшы служачым, ячэйка ня прыняла мяне ў комсамол. Такім чынам я застаўся па-за шэрагам саюзу толькі таму, што маё афармленьне цягнулася два з паловай гады“.

Падобныя выпадкі ня рэдкія. Гэта і прымусіла ЦК УсеЛКСМ у сваёй пастанове з усёй вастрынёю падкрэсьліць абсалютна недапушчальную зацяжку афармленьня новаўступаючых у комсамол“. Цэнтральны камітэт прапанаваў: „усім камітэтам і ячэйкам забясьпечыць уступленьне новых членаў у комсамол ня больш, чым у двухдэкадны тэрмін ад падачы заявы да атрыманьня членскага білета“, абавязаўшы пры гэтым усе камітэты і рэвізійныя камісіі УсеЛКСМ „прыцягваць да самай строгай адказнасьці кіраўнікоў оргагавізацый, аж да зьняцьця з працы зацягваючых афармленьне новаўступаючых у комсамол“.

Што паказвае лічба росту за апошнія месяцы

Якое-ж становішча з ростам вытворчых організацый мы маем на сёньнешні дзень, пасьля 5-ці месяцаў ад 9-га зьезду.

На апошнім сэкратарыяце ЦК ЛКСМБ (23-VI-31 г.) былі заслуханы даклады буйных вытворчых адзінак Віцебску, Барысава, Магілёва.

У сваім дакладзе сэкратар Віцебскага гаркому Казлоў прывёў наступныя лічбы росту:

З 1-га студзеня па 1-е сакавіка Віцебская організацыя вырасла на 899 чал., за красавік і май—на 1029, чэрвень быў пераломным у адносінах тэмпаў росту. З 1 па 20-е г. зн. за 20 дзён, у організацыю ўлілося 900 чал. З іх рабочых 695, дзяцей рабочых 60.

У Магілёве за апошнія 5 месяцаў організацыя вырасла на 780 чалавек; за лік гораду—на 523, вёскі—257. пролетарскае ядро—62,4 проц.

Па месяцох: красавік—164, май—177, за 23 дні чэрвеня—201. Рост зусім недастатковы.

Яшчэ горшыя паказчыкі дае Барысаў.

На заводзе „Домбаль“, дзе працуе 540 чал. ці 60 проц. рабочае моладзі, у комсамоле толькі 120 чал.

Да апошняга часу на заводзе замест росту назіраўся адсеў. І толькі за апошнія дні ў комсамол падана 45 заяў.

На лесазаводзе „Чырвоны мэталіст“ моладзі—160, у комсамоле—90. За апошнія тры месяцы ў саюз уступіла ўсяго 22 чал.

На самым буйнейшым у Барысаве прадпрыемстве—фабрыцы „Чырвоная Бярэзіна“—моладзі 1036 чал, у комсамоле—600.

У Гомелі—ня лепшае становішча. Сэкратар Гомельскага гаркому Камісарчык у сваім артыкуле („Чырвоная зьмена“ ад 13-6-31.) піша:

„Рост Гомельскай організацыі зусім недастатковы.

За першы квартал 1931 году мы вырасьлі ўсяго на 948 чал., ня гледзячы на агромністую базу росту. На заводзе „Ланцуцкага“ рабочай моладзі 600, у комсамоле—180. Сельмаш—700, у комсамоле—300. ФЗВ чыгуначнікаў—1020, у комсамоле—450. „Рухавік рэволюцыі“—400, у комсамоле 200. Добруш—моладзі каля 100, у комсамоле 260 і г. д.“

Менскі і Віцебск ідуць уперадзе

Зусім іншыя паказчыкі за апошні час дае Менск. Дзякуючы шырока разгорнутай масавай рабоце, праводзяцца агульна-гарадзкія зьлёты рабочай моладзі-ударнікаў, склікаюцца цэхавыя нарады, добра працуюць групоргі,—у росьце карэнны пералом.

На агульна-гарадзкім зьлёце малавых ударнікаў 10 чэрвеня у комсамол падана 1000 заяў.

На заводзе „Комунар“ моладзі 290 ахоплена саюзам—250.

На заводзе „Полымя Рэволюцыі“ моладзі—110, у комсамоле—97.

Паказчыкі Менску і Віцебску лішні раз падкрэсьліваюць, што пры шырока разгорнутай масавай рабоце, пры дыфэрэнцыйным падыходзе да паасобных груп рабочай моладзі можна дабіцца істотнага пералому ў галіне росту і чым далей, тым больш хуткага ходу к фінішу.

На вопыце Менску і Віцебску павінны вучыцца ўсе вытворчыя організацыі Беларусі.

У наступным артыкуле мы спынімся на ахопе комсамолам фабзавучнікаў.

НА АСНОВЕ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНЫ І ЎЛІКУ РАЗЬВІВАЦЬ ТЭМПЫ СЕНАЎБОРКІ



Усім сэкратаром РК і брыгадзірам ЦК

Ня глядзячы на шматразовыя патрабаваньні ЦК аб тым, каб райкомы дасылалі ў цэнтральны штаб кіраўніцтва комсамольскім паходам опэрацыйныя штодзённыя зводкі аб колькасьці мобілізаваных у лік 15000, аб ліку колгасаў, у якіх началася работа, аб колькасьці колгасьнікаў, да якіх даведзена працоўная кніжка,—Бабруйскі, Гомельскі, Рэчыцкі, Сіроцінскі, Парыцкі і іншыя райкомы да гэтага часу зводак не дасылаюць, чым зрываюць плянавую работу і яе ўлік.

ЦК ЛКСМБ у апошні раз папярэджвае ўсіх сэкратароў райкомаў і патрабуе рэгулярна, штодзённа дасылаць опэрацыйныя весткі ў цэнтральны штаб.

Адпачасова ЦК прапануе ўсім сваім брыгадзірам праверыць РК, як яны выконваюць пастанову ЦК аб паходзе за ўлік працы ў колгасах і мобілізацыі ў лік 15 тысяч.

ЦК ЛКСМБ.

Колгасы „Комбайн“ і „Прогрэс“—у авангардзе

На 20 чэрвеня колгасамі Слуцкага раёну скошана і ўбрана 128 га канюшыны і 126 га сенажаці.

Першымі ў разгортваньні сенаўборкі ідуць колгасы: „Комбайн“, „Комінтэрн“, „Прогрэс“, „Бальшавік“.

„Прогрэс“ на 20-ае ўбраў 1000 пудоў сена, скасіўшы 20 га сенажаці і 18 га канюшыны. „Комінтэрн“ скасіў 25 га сенажаці. Колгас „Бальшавік“ 25 га і г. д.

Сенаўборачная кампанія праходзіць на аснове зьдзельшчыны і дакладнага ўліку колькасьці і якасьці работы кожнага колгасьніка. У кожным колгасе складзены брыгады касцоў, грабельшчыкаў і возчыкаў.

Новік Я.

ЗАМЕСТ ПЯЦІ—У ТРЫ

МАГІЛЁЎ, 26. У раёне разгарнулася масавая касьба канюшны. Колгас „Комінтэрн“, Слабодзкага сельсавету, скончыў касьбу 18-га чэрвеня. Замест 5 дзён па пляну, скасілі ў тры дні.

У выніку правільнай організацыі зьдзельшчыны скончана сяўба канюшні ў колгасе „1-га мая“.

Белта.

На ўдарныя тэмпы

Уборка сенажаці ў Брагінскім раёне ідзе шпаркімі тэмпамі. На 20-е чэрвеня ўбрана канюшны 560 га, сенажаці 200 га. Хрукавіцкая ячэйка організавала яндзельнік, на якім працавала 80 чалавек. Награблі 300 коп канюшні.

Вальбачоў.

Даць колгасам рахункаводаў

Старыя дарогі. У Насецкім сельсавеце 5 колгасаў. Улік працы колгасьнікаў не наладжаны бо няма рахункаводаў. Райколгассаюз не думае аб падрыхтоўцы кадраў рахункаводаў. Адсутнасьць сталага вучоту працы ў колгасах дрэнна адбіваецца на вытворчасьці працы.

Райком комсамолу павінен мобілізаваць і паслаць у гэтыя колгасы комсамольцаў для ўліку працы колгасьнікаў.

У. П. А.

На Тураўшчыне,—тэмпы ня ўзяты

Ня губляючы ні хвіліны, уключыцца ў паход за ўлік працы ў колгасах, за ўзмацненьне тэмпаў сенаўборкі

У Тураўскім жывёлагадоўчым раёне праца колгасаў у вясеньнюю пасеўкампанію праходзіла бяз усякага ўліку. Зьдзельшчына была прынята формальна. Ня было колькаснага і якаснага ўліку працадзён, з-за чаго гублялася асноўная сутнасьць зьдзельшчыны.

Зараз абвешчан комсамольскі паход за правільны ўлік у колгасах. Здавалася-б, што райком комсамолу павінен быў за яго ўхапіцца і пабаявому, па-опэрацыйнаму выступіць на дапамогу колгасам, увязаўшы яе з ударнымі тэмпамі разгортваньня сена-уборачнай кампаніі. Але непаваротнасьць, абломаўшчына моцна схапіла ў цісکі тураўскіх райкомаўцаў.

Надоячы, на пашыранай нарадзе сэкратароў ячэек слухалася пытаньне аб ахове ўраджаю. А пра сенаўборку, пра комсамольскі паход, пра ўлік працы,—ні слова.

У раёне яшчэ дагэтуль не пачалася ўборка сенажаці. Комсамольскія ячэйкі, па „прыкладу“ райкому, чагосьці чакаюць.

Колгас „Чырвоны Кастрычнік“ мае вялікую колькасьць сенажаці, а касіць яшчэ і не пачыналі. Вінавата праўленьне і комсамольская ячэйка, якая плянецца ў хвасьце „тэмпаў“ і бязьдзейнічае.

Калі некаторыя комсамольскія ячэйкі колгасу „Новае жыцьцё“ на агульным сходзе ўзьнялі пытаньне аб тым, што пара рыхтавацца да сенаўборкі, дык сэкратар ячэйкі адзёрнуў: „Сёньня сход. На наступным паседжаньні бюро пытаньне разьбярэм дэталёва“.

Мы б'ем трывогу. Комсамол Тураўшчыны павінен неадкладна ліквідаваць адставаньне ў тэмпах. Уключыцца і пасьпяхова правесьці паход за правільны ўлік у колгасах. Увязаць яго з узмацненьнем тэмпаў сенаўборачнай кампаніі, каб потым па-ўдарнаму пераключыцца на ўборку ўраджаю.

Брыгадзір „Ч. З“.—С-кі.

Зрыўшчыкі ўліку працы знойдзены

Магілёў. Раённыя організацыі і газэта „Комунар Магілеўшчыны“ уключыліся ў паход за правільны ўлік працы ў колгасах. Для практычнага правядзеньня паходу, 24-га чэрвеня пасланы ў колгасы 134 ударнікі і кваліфікаваныя рахункаводы.

Высьветлены агідныя зьявішчы ў працы райколгассаюзу, які зрываў вучот. Атрыманыя з цэнтру працоўныя кніжкі ляжалі на складах нераспакаванымі. Ніводзін колгас не атрымаў іх. Упаўнаважныя па пасеўкампаніі, ведаючы аб гэтым, не рэагавалі. Вінаватыя перадаюцца ў РКК-РСІ для прыцягненьня да адказнасьці.

Белта.

На аснове зьдзельшчыны з улікам працадзён

Колгасы Пукаўскага сельсавету па-ўдарнаму ўзяліся за ўборку сенажаці (Грэскі раён). На 21-е чэрвеня ў колгасе „Баявік“ убрана 114 га і скошана 40 га. У колгасе „Сталінец“ убрана 30 га, скошана 10.

Праца пераведзена поўнасьцю на зьдзельшчыну і правільны ўлік працы па брыгадах. У колгасе „Баявік“ на касьбе і ўборцы працуе 9 брыгад. Прынятыя нормы зьдзельшчыны колгасамі перавыконваюцца.

Брыгадзір „Ч. З.“ Ц Макарэнка.

Зьлёт ільнаводаў-ударнікаў

ВІЦЕБСК, 28. На 1-е ліпеня Белколгасцэнтр склікае ў Віцебску агульны беларускі міжраённы зьлёт колгасьнікаў-ударнікаў ільнаводчых раёнаў Беларусі. У зьлёце прымуць удзел 300 дэлегатаў. Зьлёт падвядзе вынікі сяўбы і абгаворыць правядзеньне ўборкі.

БЕЛТА.

32—цэхам хэмічнай прамысловасьці

ВІТАНЬНЕ ВЫПУСКУ 32!

Другі выпуск хэміка-тэхнолёгічнага тэхнікуму ўлівае ў строй барацьбітоў за прамфінплян новыя падрыхтаваныя кадры

МАЦНЕЙ ШТУРМ ВЫШЫНЬ ТРЭЦЯГА РАШАЮЧАГА!

Бальшавіцкае прывітаньне новым тэхнікам

Пасьля ўпартай барацьбы за перамогу цяжкасьцяў, у бальшавіцкай напружанасьці на працягу трох год вучобы, канчаюць пасьпяхова курс навучаньня ў хэміка-тэхнолёгічным тэхнікуме 32 чал.

32 тэхнікі-хэмікі, ауладаўшы тэхнікай, будуць самымі актыўнымі праваднікамі лёзунгу партыі: „Тэхніку—у масы“.

Выпуск новых барацьбітоў за бальшавіцкія тэмпы і ауладаньне тэхнікай—чарговая перамога комуністычнай партыі і рабочай клясы на фронце падрыхтоўкі чырвоных спэцыялістых для будаўніцтва соцыялізму.

Трыкутнік ХПТ, вітаючы выпускнікоў, упэўнены, што яны прыложаць усе свае сілы і веды, каб пасьпяхова скончыць 3-ці рашаючы год пяцігодкі—фундамант соцыялістычнай будоўлі.

Дырэктар ХПТ ЦЕМЕХМАН.
Сэкратар ячэйкі КП(б)Б КАЦ.
Старшыня профкому—ШВЕЦ.

Новае папаўненьне

Летась хэмічнае аддзяленьне Менскага політэхнікуму рэорганізавалася ў Хэміка-тэхнолёгічны тэхнікум. Гэта рэорганізацыя ўнесьла значны пералом у працу аддзяленьня і дала вялікі зрух у справе ператварэньня тэхнікуму ў сапраўды адпавядаючую запатрабаваньням навучальную ўстанову-кузьню кадраў для хэмічнай прамысловасьці.

Калі летась у нас былі толькі дзьве лябораторыі, дык сёлета мы ўжо маем 5, і да таго-ж добра абсталяваныя.


Клячкін

Сёньня выпускаецца наш трэці курс. Ён дае 5 спэцыялістых гарбароў, столькі-ж шклянікаў, аднаго па маслабойнай справе, аднаго па кондытарскай, і 4-х па будаўнічым матар'ялам.

За тры гады мы добра вывучылі вытворчасьць. Кончыўшы вучобу, мы здолеем поўнасьцю апраўдаць сябе на той рабоце, якая будзе нам даручана.

Выпускнік Клячкін.

Годы сябе апраўдалі!

Наш выпуск зьяўляецца першым з тых набораў, якія праведзены пасьля вядомага шахцінскага процэсу. Наш набор унёс карэнную зьмену ў працу тэхнікуму, адпавядаючы запатрабаваньням, якія прад'явіў нам час. На наш курс былі прыняты ў большасьці рабочыя і дзеці рабочых. Гэтая частка студэнтва паказвала прыклады ў барацьбе за ауладаньне тэхнікай, за падрыхтоўку кадраў.

Ня менш глыбокія зьмены ў наша жыцьцё ўнесла бесьперапынная вытворчая практыка. Зараз практыка пачынаецца з самага першага курсу.


Крэсава

Наш трэці курс за час вучобы перажыў рэконструкцыю ўсёй сыстэмы навучаньня: спэцыялізацыю навучальных устаноў і г. д. Ён сьведка дасягненьняў, якіх мы дабіліся ў справе падрыхтоўкі кадраў, дзякуючы правільнаму правядзеньню генеральнай лініі партыі.

Выпускнік Ліўшыц.

Аб людзях

Партыя дала загад: даць нарастаючай прамысловасьці добра падрыхтаваныя кадры. Даць фабрыкам і заводам новых чырвоных спэцыялістых, адданых справе рабочае клясы.

Сёньня выпуск.

Гэты выпуск супадае з гадавінай існаваньня нашага тэхнікуму.

Наш выпуск—3 гады вучобы, 3 гады рэконструкцыі цэхаў вучобы.

Гэтыя тры гады выявілі лепшых, адданых справе і барацьбе.

Гэтыя тры гады выявілі і асобных людзей, якія не апраўдваюць сябе, якія не паддаліся выхаваньню колектыву, не расьлі з ім, не выканалі пастаўленых задач.

Зараз—аб першых.

Трыкутнік тэхнікуму прэміруе 7 лепшых ударнікаў на фронце падрыхтоўкі кадраў—штурмавікоў навукі і тэхнікі, барацьбітоў за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады. Яны: Ліўшыц, Кадышэвіч, Краўчанка, Вінёўка, Клячкін, Сарокіна і Крэсава.

Г. Я.

Кадышэвіч

Краўчанка


Ліўшыц, Сарокіна, Вінёўка

Будаваць за тыдні моцнасьцю на стагодзьдзі

Змагацца за кожную лішнюю цэглу, змагацца за кожны цэмэнту грам!

Цагельныя заводы не надалі належных тэмпаў сваёй рабоце. Па раду раёнаў будаўнічыя пляны пастаўлены пад пагрозу зрыву

Комсамол заводаў і фабрык павінен перадаць свой вопыт лясам будоўлі

Выправіць памылку

Мінула 5 месяцаў як бюро комсамольскага колектыву БЖС вынесла пастанову ўзяць на сабе правядзеньне работ на ударнай комсамольскай пабудове. З гэтай мэтай быў вызначаны для будаўніцтва Інстытут санітарыі і гігіены і Дашкольны тэхнікум.

Пачалася падрыхтоўка да будаўніцтва, але... гэту пабудову ліквідавалі.

Справа ў тым, што Дзяржплян перанёс яе ў чаргу няўдарных і другарадных.

Бюро комсамольскага колектыву не паклапацілася аб тым, каб маладзёжная ўдарная пабудова існавала.

Тут неабходна было накіраваць ініцыятыву і энэргію комсамольскіх організацый на больш адказныя вучасткі з тым, каб ператварыць іх ва ўдарную маладзёжную пабудову.

Пакуль ня позна, памылку трэба выправіць.

Брыгада „Ч. З.“ Л. К. Г.

Будаўнічы комсамол чакае буксіру

Буйныя прадпрыемствы, як завод Варашылава, „Комунар“, „Бальшавік“ і рад іншых, дабіліся вялікіх посьпехаў у галіне аўладаньня тэхнікай. У гэтай рабоце яны назапасілі вялікі вопыт. Ведаюць як трэба і як ня трэба організоўваць работу, ведаюць мэтоды работы, як прыстасаваць барацьбу за аўладаньне тэхнікай да ўмоў барацьбы за прамфінплян.

Мэханізацыя будаўніцтва знаходзіцца зараз на надзвычайна нізкім узроўні. Рад процэсаў праводзіцца самымі старадаўнымі, адсталымі мэтодамі. Рад мэханізмаў не скарыстоўваецца. Часам яны прастойваюць большую частку сэзону. А аб рацыяналізатарскай рабоце на пабудовах дык наогул цяжка гаварыць.

Паход за тэхніку сярод будаўнічай рабочае моладзі разгорнуты вельмі слаба, ён ня выліўся яшчэ ў паход за рацыяналізацыю, за поўную нагрузку мэханізмаў, за стандартызацыю будаўніцтва.

Новыя масы сэзоньнікаў, што ўліваюцца ў рады будаўнікоў, ня прыносяць з сабою неабходных тэхнічных ведаў, не пасьпяваюць за тымі тэмпамі, якія прад'яўляе нам час.

Комсамольскія організацыі буйных фабрык і заводаў павінны перадаць свой вопыт у організацыі тэхнічнай вучобы, у рацыяналізацыі работ, у барацьбе за якасьць продукцыі моладзі з рыштаваньняў, павінна дапамагчы ёй дабіцца лепшых посьпехаў у выкананьні будаўнічых плянаў.



Будаўнічы комсамол чакае дапамогі і буксіру ў гэтай рабоце ад комсамолу фабрык і заводаў.

Яны нам павінны адказаць як мага хутчэй.

Будаўнік Асташынскі.

Улічэце дні

У Заслаўскім раёне будаўнічыя работы разгорнуты вельмі дрэнна. Неабходны для будоўлі лесаматар'ял вывезены толькі на палову, а каменьня зусім няма.

Цагельныя заводы, якія знаходзяцца ў гэтым раёне, працуюць бяз поўнай нагрузкі, тады як пабудова перажывае значны недахоп цэглы.

У выніку гэтага зрываецца будаўніцтва Траскоўскага ўрачэбнага пункту, будаўніцтва Старасельскай сямігодкі і г. д. РВК і некаторыя сельсаветы не выяўляюць зацікаўленасьці ў будаўніцтве. Людзі ня ўлічылі, што засталіся абмежаваныя дні для будаўніцтва, што з пачаткам уборачнай кампаніі, а там і асеньніх работ будаўніцтва разгарнуць будзе немагчыма.

Гэта неабходна ўлічыць і ўзяць патрэбныя тэмпы.

Я Прыбытак

Павярнецеся тварам да цэглы

Прамфінплян другога кварталу на цагельным заводзе Менбудтрэсту выкананы ўсяго на 23 проц. Гэта аб колькосных паказчыках.

Ня лепш з якасьнымі. Дрэнна апальваецца цэгла. Завод выпускае... 40 проц. браку!

Тлумачыцца гэта слабым разгортваньнем социялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, шматлікімі прагуламі, выпадкамі п'янкі, дрэннымі адносінамі паасобных рабочых да працы і інструмантаў.

Прыкладаў багата. Вось рабочы заводу Бабровіч. За май месяц ён напусьціў 10 прагулаў, прыходзіць на работу амаль заўсёды п'яным. Можна прывесьці рад аналёгічных прыкладаў.

Комсамольскай ячэйкі на заводзе як-бы ня відаць. Ніякай работы па разгортваньню соцспаборніцтва і ўдарніцтва за выкананьне прамфінпляну не праводзіцца.

Тут выяўляецца і слабае кіраўніцтва гарадзкога камітэту комсамолу комсамольскай ячэйкай. Акрамя дырэктыў ніхто ні разу ня бываў на заводзе, ды і самі дырэктывы давалі я агульнага характару, не прыстасаваныя да ўмоў комсамолу цагельнага заводу.

Цагельнаму заводу і яго комсамольскай ячэйцы неабходна дапамога. Усе будаўнічыя ячэйкі, а таксама гарадзкі камітэт комсамолу, павінны зьвярнуць увагу на працу цагельных заводаў, павярнуць іх тварам да цэглы.

З свайго боку, наша брыгада бярэ абавязак наладзіць працу насьценгазэты, разгарнуць юнкораўскую работу і чым толькі будзе магчыма дапамагаць у рабоце комсамольскай ячэйкі.

Брыгада „Ч. З.“ Міхалевіч, Бяляўскі і Букчын

10 ліпеня—усебеларускі рабселькораўскі зьезд

11 дзён, якія засталіся да зьезду, зрабіць ударнымі днямі

Змагацца за маладзёжныя старонкі і куткі ў шматтыражках і раённых газэтах

Аб выніках рэйду па праверцы падрыхтаванасьці да ўсебеларускага зьезду рабселькораў

Пастанова прэзыдыуму Менскай гарадзкой КК-РСІ

Прэзыдыум Менскай гарКК-РСІ, заслухаўшы матар'ялы рэйду, праведзенага гарКК-РСІ з рэдакцыямі газэт „Зьвязда,“ „Рабочий“, Рабселькор“, пры ўдзеле газэты „Савецкая Беларусь“ констатуе:

1. Побач з прыкладамі масавай, дзелавой падрыхтоўкі да ўсебеларускага зьезду рабселькораў на радзе прадпрыемстваў Менску (завод імя Варашылава, завод „Бальшавік“ і г. д.) з боку кіраўніцтва асобных парт'ячэек і фабзаўмясцкомаў ёсьць опортуністычная недаацэнка рабселькораўскага руху і нізавога друку, што ў прыватнасьці знайшло свой адбітак у амаль поўнай адсутнасьці работы па падрыхтоўцы да зьезду рабселькораў на частцы прадпрыемстваў Менску:

а) на заводзе „Пролетары“ поўнасьцю правалена падрыхтоўчая работа да зьезду (не праапрацавана пастанова ЦК УсеКП(б) аб перабудове рабселькораўскага руху, не абгавораны проекты тэзісаў зьезду рабселькораў, з 1-га мая ня выходзіць заводзкая насьценгазэта);

б) на фабрыцы „Акцябр“ у падрыхтоўку да зьезду ня ўцягнута маса рабочых (на агульна-рабочым сходзе прысутнічала з 1700 чалавек—толькі 40);

в) на заводзе „Дрэваапрацоўшчык“ абгаварэньне проектаў тэзісаў праведзена формальна, без непасрэднай увязкі з яшчэ большай мобілізацыяй рабочай масы на выкананьне асноўных гаспадарча-політычных задач;

г) на заводзе „Полымя Рэвалюцыі“ адсутнасьць партыйнага кіраўніцтва ні завым друкам прывяла да фактычнай адсутнасьці насьценных газэт на заводзе;

у друкарні імя Сталіна ў невыстарчальнай меры разгорнута масавая работа сярод рабкораў, не выкарыстоўваецца падрыхтоўка да зьезду рабселькораў для лепшага наладжваньня работы насьценгазэт і шматтыражкі, не організавана складаньне тэзісаў па поліграфічнай прамысловасьці.

д) рэдакцыі цэнтральных газэт „Чырвоная Зьмена“ і ў асаблівасьці „Раўдонасіс Артояс“ да гэтага часу на забясьпечылі разгортваньне сыстэматычнай і пасьлядоўнай падрыхтоўчай работы да зьезду (рэдакцыя газэты „Раудонасіс Артояс“ нават ня прымала ўдзелу ў падрыхтоўцы тэзісаў, газэта „Чырвоная Зьмена“ ня досыць завастрае ўвагу на організацыі масавага абгаварэньня тэзісаў);

е) партыйныя ячэйкі Белколгасцэнтру і Сьвінаводтрэсту не забясьпечылі практычнага ўдзелу грамадзкасьці гэтых прадпрыемстваў у рабоце па падрыхтоўцы зьезду.

Прэзыдыум гарКК„РСІ настанаўляе;

1. За недаацэнку нізавога друку, рабселькораўскага руху і справы падрыхтоўкі да ўсебеларускага зьезду рабселькораў абвясьціць вымову бюро партыйнага колектыву заводу „Пролетары“ ў складзе т. т. Заяца, Сьцяпанава, Шамец, Шлангрыса, Корчына Гонделяка і Гуліса і старшыні заўкому т. Сьцяпанава.

2. Папярэдзіць партколектывы і фракцыі фабзаўкомаў фабрыкі „Акцябр“ завод „Дрэваапрацоўшчык“, „Полымя Рэволюцыі“ і друкарні імя Сталіна, а таксама парт'ячэйкі і фракцыі мясцкомаў Белколгасцэнтру і Сьвінаводтрэсту аб неабходнасьці безадкладна забясьпечыць рашучы пералом у справе падрыхтоўкі да зьезду рабселькораў.

Прэзыдыум Менскай КК-РСІ абавязвае усе партыйныя ячэйкі і фракцыі фабзаўмясцкомаў гораду Менску скарыстаць 14 дзён, што засталіся да зьезду, для разгортваньня масавай дзелавой работы на падрыхтоўцы да зьезду рабселькораў, непасрэдна ўвязваючы падрыхтоўчую работу з узмацненьнем барацьбы за дзейнасьць матар'ялаў, якія зьмяшчаюцца ў друку.

Пастанову абвясьціць у друку.

Маладзёжныя старонкі і куткі павінны быць

Пастанова ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб перабудове рабселькораўскага руху шырока распрацавана на юнкораўскіх нарадах і у паасобных маладзёжных брыгадах заводу „Бальшавік“.

У зьвязку з месячнікам друку і падрыхтоўкай да Ўсебеларускага зьезду рабселькораў, юнкорамі заводу „Бальшавік“ праведзены некалькі ўнутрызаводзкіх рэйдаў на розных пытаньнях. Зараз на заводзе 90 рабкораў і 12 юнкораў штодзённа і сыстэматычна ўдзельнічаюць у працы насьценгазэты і шматтыражкі.

З недахопаў трэба адзначыць тое, што ў насьценгазэтах няма яшчэ маладзёжнай старонкі і кутка. Шматтыражка заводу „Рабочае века“ адкрыла маладзёжную старонку, але назьве сваёй яна зусім не адпавядае, бо выходзіць з вялікімі перабоямі.

Бюро комсамольскага колектыву не пастаралася скласьці належныя умовы для рэгулярнага выхаду маладзёжнай старонкі, ня стала на чале юнкораўскай ініцыятывы. З юнкорамі штодзённай масавай працы амаль не праводзіцца, нарады праходзяць па-кампанейску. Юнкорбрыгады не распрацавалі яшчэ тэзісаў гарбарнай прамысловасьці.

Насьценгазэта хромавага цэху адстае. Да гэтага часу не зьмясьціла ніводнага артыкулу аб надыходзячым зьезьдзе рабселькораў. Комсамольская ячэйка данага цэху не перабудавала сваёй працы адпаведна з чарговымі задачамі, што стаяць зараз на абвестцы дня.

Колькасьць юнкораў на заводзе яўна нездавальняючая. Зараз, у зьвязку з надыходзячым рабселькораўскім зьездам, лік юнкораў на заводзе павінен быць значна павялічаны.

Брыгада „Ч. З“. Кузьмэнка і Дземеньцеў

Бюро комсамольскага колектыву юнкорамі ня кіруе

На заводзе імя Варашылава (Менск) налічваецца каля 350 рабкораў і юнкораў. Але дапамогі ў сваёй працы ад комсамольскага колектыву не атрымліваюць. Комсамольскі колектыў, у поўным сэнсе гэтага слова,—паяцецца ў хвасьце юнкораўскага руху заводу. Такое важнае політычнае пытаньне, як падрыхтоўка да Ўсебеларускага зьезду рабселькораў бюро комсамольскага колектыву яшчэ дагэтуль ня ставіла на абгаварэньне юнкораў і ўсёй рабочай моладзі заводу.

Як-жа цікавіцца бюро комсамольскага колектыву, а таксама і цэхавыя ячэйкі пытаньнямі друку? Аб гэтым ясна гавораць цэхавыя насьценгазэты, якія ня маюць свайго месца, а валяюцца пад варштатамі і дзе папала.

Адміністрацыя і некаторыя грамадзкія організацыі не рэагуюць на зьмешчаныя ў насьценгазэтах допісы юнкораў і рабкораў. Многія заметкі тэрмінова патрабуюць рэагаваньня, але-ж яго няма. У юнкора-рабкораўскай масы адпадае ўсякая ахвота пісаць у насьценгазэту.

Заводзкая шматыражка „Чырвоны молат“, у параўнаньні з насьценгазэтамі, ужо мае некаторыя дасягненьні. Яна здолела згуртаваць вакол сябе моцнае ядро рабкораў і юнкораў з якімі вядзе штодзённую працу. Некалькі рэйдаў, наладжаных унутры самога заводу, вельмі зацікавілі хлопцаў.

Бюро комсамольскага колектыву зараз-жа павінна стаць на чале юнкорруху і памятаць, што кіраўніцтва ім зьяўляецца неад'емнай задачай комсамольскай організацыі.

Брыгада „ЧЗ“ Семянцоў, Крэсік.

Слуцкі РК ня кіруе юнкораўскім рухам

Слуцкі РК ЛКСМБ мала зьвяртае ўвагі на разгортваньне юнкорруху. У раёне мала практыкуецца вопыт працы юнкорбрыгад. Юнкоры ў большасьці працуюць упаасобку. Вось прыклады: У падтэхнікуме больш 800 студэнтаў, а студкораўскіх брыгад да гэтага часу няма. Організацыя брыгад была даручана адной студэнтцы, але ёй гэта работа не спадабалася, і яна не працуе.

Райком ЛКСМБ, час зьвярнуць увагу на гэта зьявішча.

Непачаловіч і Усеня.

Аб'ява

Цэнтральная дзіцячая тэхнічная станцыя склікае на 29-е чэрвеня 1931 г., а 8 гадзіны ўвечары, нараду ўсіх юных тэхнікаў і юных вынаходцаў гораду Менску па пытаньню падрыхтоўкі да другога Ўсебеларускага зьлёту піонэраў.

Нарада адбудзецца ў памяшканьні цэнтральнай дзіцячай тэхнічнай станцыі (Савецкая 90, былы піонэрскі клюб, каля кіно „Чырвонай зоркі“).

Яўка ўсіх абавязкова.

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

Друкарня імя тав. Сталіна. Галоўлітбел № 599